СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ЖНІЎНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 161 (28271)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Будучыня за двайнымі дыпломамі



Новыя факты з жыцця мастака



Крывавы лёс Емена

СТАР. 13

# ПЕДАГАГІЧНАЯ ПАЭМА. ПАЧАТАК



Фота БЕЛТА.

**Калектыў віцебскай сярэдняй школы №45 перад новым навучальным годам папоўніўся адразу чатырма маладымі спецыялістамі — сёлетнімі выпускнікамі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Машэрава. Наталля ЦЯЦЮЕВА будзе выкладаць матэматыку, Раман МУРАШКІН весці ўрокі фізкультуры і здароўя, Юлія АНІШЧАНКА працаваць з вучнямі пачатковых класаў, а Ганна ЕРАШОВА вучыць дзяцей замежным мовам.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім РЫЖАНКОЎ, першы віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта**

*«Яшчэ перад пачаткам Алімпіяды і Нацыянальны алімпійскі камітэт, і Мінспорту заяўлялі, што будуць вельмі складаныя старты і неабходна выступіць так, каб беларускі народ ганарыўся сваімі спартсменамі. На мой погляд, зыходзячы з умоў, у якіх апынуліся многія беларускія атлеты не па сваёй віне перад стартам летняй Алімпіяды ў Бразіліі, наша каманда выступіла годна».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9354 ▲ | |
| Еўра | 2,1832 ▼ | |
| Рас. руб. | 0,0300 ▼ | |
| Укр. грыўня | 0,0764 ▲ | |

ISSN 1990 - 763X

■ Выпрабавана на сабе

# ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ НЕ МАЕ ЎЗРОСТУ

## Пенсіянеры на рынку працы

**Сярэдні памер пенсій у Беларусі 290 дэнамінаваных рублёў. На такія грошы можна пражыць. Але пры гэтым адмаўляць сабе нават у самым неабходным. Ды і наогул шмат хто з маладых пенсіянераў не ўяўляе сябе без работы. У нашай краіне дыскрымінацыя па ўзросце пры прыёме на работу забаронена законам. Але ў наймальнікаў часта спрацоўвае стэрэатып.**

У прыватнасці, майму знаёмаму начальнік сказаў адкрыта: мне патрэбны маладыя, якія будуць маўчаць і выконваць усе мае загады, а ты, спецыяліст з вопытам, пачнеш вучыць мяне, як працаваць. Вось і атрымліваецца, што пенсіянеры самая неабароненая частка грамадства пры працаўладкаванні. І гэта, нягледзячы на тое, што шмат хто з іх валодае не толькі прафесіяналізмам, але і добрым здароўем. І, без перабольшвання, можа даць фору моладзі. Ды не ўсё так безнадзейна. Карэспандэнт «Звязды» на асабістым вопыце высвятляла, куды ахвотна прымаюць сталых людзей.



### Апякун для сабакі

На запыт у інтэрнэце наконт чалавека, які выгульвае сабак, выскачыла некалькі дзясяткаў аб'яў. А раптам пашчасціць? На супрацьлеглым канцы проваду прыемны жаночы голас. Адразу папярэджваю, што я пенсіянерка. «Ну што ж, прыходзьце, пазнаёмімся», — запрашае мяне на сустрэчу патэнцыйная наймальніца.

СТАР. 3

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

## САЦЫЯЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ: ШТО ГАРАНТУЕ ДЗЯРЖАВА?

Свае пытанні вы зможаце задаць госцю нашай рэдакцыі — **галоўнаму спецыялісту аддзела адраснай сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяне Мікалаеўне ТАЛАЛАЕВАЙ.**

***Тэлефануйце сёння з 11 да 12 гадзін па нумары 8 (017) 287-18-71.***

Папярэднія пытанні можаце задаць па тым жа тэлефоне **з 9 да 11 гадзін** або даслаць (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас **info@zviazda.by.**

■ Надвор'е

# УДЗЕНЬ — ЦЁПЛА, А ЎНАЧЫ — ТУМАН

**У выхадныя зноў прыпячэ да плюс 30 градусаў і нават мацней**

**Паводле інфармацыі начальніка службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Дзмітрыя РАБАВА, сярэдняя тэмпература паветра на гэтым тыдні чакаецца на 5 градусаў вышэй за кліматычную норму.**

На старце гэтага тыдня ў Беларусі будзе гаспадарыць зона высокага атмасфернага ціску, на фоне якога будуць праходзіць атмасферныя франты. У сераду месцамі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы — 10—16 цяпла, а ўдзень — ад плюс 20 да плюс 26 градусаў. Сапраўды летняя спякота завітае да нас разам з зонай высокага атмасфернага ціску з боку Заходняй Еўропы ў чацвер. Усталюецца сухое надвор'е. У ноч на чацвер будзе 8—13 цяпла, а ўдзень — плюс 21—27 градусаў. У пятніцу — 23—28 градусаў.

У выхадныя на тэрыторыі краіны будзе гаспадарыць цэнтр магутнага антыцыклону. Ападкаў не будзе, але ўначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Мінімальная тэмпература паветра ўначы павялічыцца да 10—17 цяпла, удзень будзе плюс 24—29 градусаў, а па поўдні краіны пачне прыпякаць да 30—32 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*